# Рамёстваў карагод



У актавай зале тэрытарыяльнага цэнтра адкрылася выстаўка-кірмаш творчых работ — «Рамёстваў нашых карагод». Адметнасць яе ў тым, што ўсе вырабы зроблены рукамі бабуляў, якія наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту. Ёсць і жадаючыя набыць гэтыя вырабы.

Разнастайныя шкатулкі, вазы, кошыкі, дэкаратыўныя чайны домік і ветракі — усё гэта прадстаўлена на выстаўцы. Зусім нядаўна рэалізавана і цалкам новая для цэнтра ідэя — лялькі. Усе вырабы да адзінага зроблены з так званых газетных трубачак, а з дапамогай фарбы ім нададзена шматколернасць. Дапаўняюць выставачны рад мыла ручной работы, ручнікі. Гэта прадукцыя зроблена маладымі людзьмі з інваліднасцю ў майстэрнях, якія дзейнічаюць пры тэрытарыяльным цэнтры.

— Усе гэтыя вырабы могуць быць цудоўным сувенірам, падарункам

на дзень нараджэння, — падкрэслівае загадчык аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Сяргей Есіс. Балазе, плануецца «выезд» выстаўкі-продажу ў раённы Цэнтр культуры, на вуліцы нашага горада падчас масавых мерапрыемстваў. За сродкі, атрыманыя ад продажу, у тэрытарыяльнага цэнтра з'явіцца магчымасць набываць неабходныя для творчасці матэрыялы.

Дарэчы, пра творчасць. Знаёмства з выстаўкай-продажам адбылося акурат падчас аднаго з мерапрыемстваў — творчай сустрэчы членаў клуба «Гады — не бяда», прысвечанай Дню Незалежнасці. Канцэртную праграму «Квітней, мой край, пад небам жураўліным» падрыхтавалі ўдзельнікі хору «Родны кут» (мастацкі кіраўнік Міхаіл Міткевіч). Пасля за кубкам чаю яны па-сяброўску правадзілі час і, у тым ліку, дзяліліся сакрэтамі стварэння маленькіх «шэдэўраў», прадстаўленых на выстаўцы. Між іншым, ніколі не скажаш, што яны зроблены рукамі аматараў.

— Відавочны працэс станаўлення майстэрства нашых актыўных рукадзельніц, — акцэнтуе ўвагу Сяргей Есіс.

А, калі ёсць жадаючыя заплаціць за вырабы грошы, значыць, справа гэта карысная для ўсіх.

Таццяна ПЯТКЕВІЧ,

фота аўтара